***Творчая работа***
***па сацыяльна-гуманітарных навуках***
***“Вялікая Перамога ў нашай памяці жыве”***

# Памяць вайны - гэта памяць бяды, страт і пакут

## Уводзіны

Нечуваныя і нябачаныя ў гісторыі выпрабаванні выпалі на долю беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Акупацыя Беларусі працягвалася з чэрвеня 1941 года па ліпень 1944 – га. Што яна пакінула пасля сябе? Аб гэтым сведчаць факты і лічбы. За гады вайны толькі карнікамі было знішчана 4885 сёл і вёсак Беларусі.

Лічбы жахліва неверагодныя. За кожнай з іх чалавечыя лёсы, драматызм і трагізм многіх чалавечых жыццяў. Такое не забываецца. У народнай памяці застаецца на многія і многія гады – фашысцкія аблавы, замест пяшчотных матчыных калыханак, роспачны плач, замест вясёлых пералівaў гармоніка, злосная лаянка і стрэлы, стрэлы…

Усё гэта асабліва адбілася ў дзіцячай памяці, увайшло ў адкрытае дзіцячае сэрца назаўсёды:

Ты кажаш, я не ведаю вайны,
Што мне было тады гадоў замала.
Чаму ж яна мае забрала сны?
На ўсё жыццё наперад сны забрала?

скажа ад імя свайго пакалення Ніл Гілевіч.

Літвічы, Засоўе, Амнішава, Слабада – нічым не адметныя вёсачкі ў партызанскім краі на Лагойшчыне, якіх напаткала лютая доля мінулай вайны.

Ціхім майскім ранкам гэтыя вёскі былі спалены. У агні загінула 575 жыхароў. Сярод іх былі дзеці, якія ўжо ніколі не стануць дарослымі. Хто ведае, колькі б выйшла з іх цудоўных людзей працы, навукі, культуры, якімі, можа, ганарыліся б будучыя пакаленні. Але іх няма – і ніколі не будзе.

Памяць вайны - гэта памяць страт, бяды, пакут. Яна жывая, бо боль яе не затухае. Не затухае нават і ў сне.

Ванда Шапялевіч, Вікця Бардушка, Ядзя Кальніцкая, Лёня Юргінс, Рэня Грыдзюшка, Стась Ляўданскі, Лёця Шыла, Альдзя Шнэйтар, Гілена Батура – дзеці вайны, апошнія сведкі страшнай трагедыі, якая напаткала вёскі былога Амнішаўскага с/Савета.

Іменна ім давялося выжыць, каб данесці да нас праўду пра самую страшную чуму 20-га стагоддзя – фашызм. І гэта трэба жывым – дзеля жыцця, бо нездарма гаворыцца, што той, хто не памятае свайго мінулага, асуджаны зноў яго перажыць. А я, ды і маё пакаленне, гэтага не жадаем, баімся. Магчыма, менавіта памяць і страх сталі асноўным штуршком для мяне, што заставіў звярнуцца да гісторыі маёй малой радзімы, каб прасычыць, наколькі жыве Вялікая Перамога ў нашай памяці, у памяці маіх аднавяскоўцаў, каб зноў і зноў напомніць маім равеснікам, каму мы абавязаны жыццямі. У памяці ўсплывае ўрок мужнасці “Гарыць, гарыць мая Лагойшчына”, які праводзілі настаўнікі беларускай літаратуры Мяхедка А.А. і Кушнярэвіч Г.П. Я слухала радкі патрыятычнай араторыі з баладамі Ніла Гілевіча, а ў памяці чамусьці адгукалася іменна так:

Не стала Літвіч і Засоўя,
Датла скіпела Слабада –
І плакаць некаму над стратамі:
Вайна для ўсіх – адна бяда.

Беларускі паэт гаварыў аб сваёй гайненскай трагедыі. А трагедыя маёй малой радзімы паўстае жахлівымі лічбамі табліцы:

***Населеныя пункты,***
***знішчаныя ў гады Вялікай Айчыннай вайны***

| Назва населенага пункта | Колькасць напярэдадні вайны | | Колькасць знішчаных | | Дата |
|---|---|---|---|---|---|
| | двароў | жыхароў | двароў | жыхароў | |
| Літвічы | 40 | 316 | 40 | 118 | май 1943 |
| Засоўе | 62 | 245 | 58 | 235 | май 1943 |
| Амнішава | 41 | 211 | 39 | 18 | май 1943 |
| Слабада | 43 | 217 | 42 | 204 | май 1943 |
| | 186 | 989 | 179 | 575 | |

Запрошаныя на ўрок Мужнасці жанчыны, чыё дзяцінства абпаліла вайна, дзяліліся сваёй бядой. Я, як і ўсе вучні, рыхтавалася да сустрэчы з дзецьмі ваеннай пары. Хтосьці з пісьменнікаў назваў іх падранкамі. І сапраўды гэта было так: ім ранілі дзіцячыя душы. Мне так шкада было нашых мілых бабуль, іх слёз, бо дзіцячыя ўспаміны застаўлялі ізноў крываточыць раны дзяцінства, што я так і не паспела спытаць у іх: “Ці даравалі вы за свой боль крыўдзіцелям?”. Іх успаміны ў нейкай ступені далі адказ на гэтае пытанне. І тады я паэтычнымі радкамі Н.Гілевіча дала сабе клятву:

Тваю трагедыю, Лагойшчына,
Што будзе помніцца да скону,
Я не пакіну неадпомшчанай
І не дарую анікому!

Беларускі народ адпомсціў фашыстам Вялікай Перамогай. А я, каб даравяць, павінна зразумець многае. Разуменне прыйшло праз даследванне гісторыі Амнішаўскага сельскага Савета ў перыяд 1941 – 1944 г.г.

По кнізе “Памяць” радок за радком я прасачыла гісторыю партызанскага руху на тэрыторыі Амнішаўскага с/Савета. Мяне ўвесь час трывожыла: чаму менавіта Літвічы, Амнішава, Засоўе і Слабада былі спалены? Адказ просты: яны размяшчаліся на стратэгічна важнай дарозе Мінск – Віцебск – Смаленск. Не ведаю, можа я і памыляюся, але ж мне здаецца, што гэтыя населеныя пункты сталі заложнікамі свайго геаграфічнага становішча. А яшчэ гітлераўцам

не давала спакою суседняя партызанская Прусаўшчына. Адтуль партызаны выходзілі з дыверсіямі на шашу і астанаўліваліся ў знаёмых і родзічаў з гэтых вёсак. Немцам  усё было вядома, і яны помсцілі партызанам расправай над жыхарамі Літвіч, Засоўя, Амнішава. Мае думкі падцвердзіла і дакладная запіска начальніка Плешчаніцкага паста жандармерыі Кляйн ад  3 чэрвеня 1943 г.

І тады я прыйшла да высновы, што гістарычную праўду павінны ведаць усе вучні нашай школы, бо як лічыў наш зямляк Ніл Гілевіч,

Што ж тады пільней і болей
Чалавецтву помніць трэба,
Каб яшчэ страшнейшым болем
Не працяць зямлю і неба? [1]

[1] Гілевіч Н.

Вечны матыў: Лірыка, паэмы, раман у вершах: Для ст. шк. Узросту/ Маст. А.У.Басалыга. – Мн.: Юнацтва, 1994. с. 71

# Гісторыя маёй малой радзімы

## Акупацыйны рэжым

Бяду ніколі не чакаюць.Раптоўна грымнула яна і ў той самы доўгі, самы светлы ў годзе, але які аказаўся самым змрочным у гісторыі краіны, дзень 22 чэрвеня 1941 года.Людзі яшчэ супакойвалі сябе надзеяй, што ўсё абыдзецца, але фашысцкія танкавыя армады ўжо неслі чорныя крыжы на беларускую зямлю. У небе адзін за адным праляталі або кружылі самалёты ворага. Некаторыя з іх ішлі на малой вышыні, як бы чаго вышукваючы. Выразна чулася на захадзе артылерыйская кананада.

Праціўніка доўга чакаць не давялося. Прарваўшы абарону на граніцы танкамі і артылерыяй, пад прыкрыццём самалётаў, ён імкліва рухаўся на ўсход. Савецкая Армія аказвала супраціўленне, аднак перад намнога большымі сіламі ворага вымушана была адступаць.

Акупацыйны рэжым, што быў устаноўлены гітлераўцамі на часова захопленай імі тэрыторыі нашай Радзімы, распрацоўваўся загадзя, яшчэ да нападу на Савецкі Саюз. Галоўныя яго кірункі былі выкладзены Гітлерам у сакрэтным мемарандуме “Некаторыя думкі пра абыходжанне з насельніцтвам на Усходзе” ад 25 мая 1940 года. У ім указвалася, што захопленыя ўсходнія тэрыторыі належыць разглядаць як аб’ект каланізацыі і германізацыі. Акупацыйная палітыка, гаварылася ў гэтым мемарандуме, павінна быць накіравана на тое, каб ператварыць актыўную масу “іншанароднага насельніцтва” ў напаўпісьменных рабоў.

Асноўныя палажэнні акупацыйнага рэжыму даволі падрабязна выкладзены і ў шэрагу іншых сумнавядомых дакументаў, у тым ліку ў плане “Барбароса”, які вызначыў стратэгію і тактыку нападу на СССР, генеральным плане
“ Ост”- праграме каланізацыі тэрыторыі , германізацыі , высялення і знішчэння народаў Усходняй Еўропы , у тым ліку і ў Беларусі .

Яшчэ задоўга да агрэсіі кіраўнікі трэцяга рэйха адобрылі распрацаваны гітлераўскім апаратам план падзелу захопленай тэрыторыі . Восенню 1941 года падзел часова акупіраванай Беларусі быў у асноўным завершаны . Тэрыторыю рэспублікі па лініі Полацк - Барысаў на ўсходзе , Старыя Дарогі - возера Чырвонае на поўдні , па рацэ Зальвянка і ўсходнім узлессі Белавежскай пушчы на захадзе вылучылі ў генеральную акругу, якая атрымала назву “Беларутэнія”.

Лагойшчына , якая паводле акупацыйнага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу знаходзілася ў складзе Мінскай ( Лагойскі раён ) і Барысаўскай (Плешчаніцкі раён ) акруг “Беларутэніі“, была ў ліку тых мясцовасцей Беларусі, што больш за іншыя зазналі на сабе гітлераўскую палітыку спусташэнняў , разбурэнняў і генацыду мірнага насельніцтва . За 3 гады акупацыі нямецка-фашысцкія захопнікі і іх памагатыя расстралялі , павесілі або спалілі жывымі 5969 мірных жыхароў Лагойскага (3906 чалавек ) і Плешчаніцкага (2063 чалавекі) раёнаў . Ужо ў першыя дні і месяцы акупацыі гітлераўцы па-зверску

расстралялі амаль усё яўрэйскае насельніцтва. У далейшым яны,змагаючыся з магутным партызанскім рухам і імкнучыся забяспечыць кантроль над шашой Мінск-Лагойск-Плешчаніцы-Бягомль-Лепель-Віцебск,фактычна праводзілі тут тактыку „выпаленай зямлі”,ператвараючы сельскагаспадарчы край у „зону пустыні”.З верасня 1941года да чэрвеня 1944 фашысты правялі на Лагойшчыне 11 буйных карных аперацый,падчас якіх забівалі людзей,палілі вёскі(часта разам з жыхарамі),забіралі сялянскую жывёлу,харчаванне і іншую маёмасць.

Аднак асобныя тыпова-бандыцкія налёты гітлераўцаў і падначаленых ім паліцэйскіх фарміраванняў (напрыклад „украінскага”, паліцэйскага батальёна, што стаяў у Плешчаніцах)на вёскі Лагойшчыны адбываліся амаль штодня. Надзвычайнай жорсткасцю і цынізмам вызначаліся дзеянні спецыяльнага карнага батальёна,набранага з крымінальнікаў розных нацый пад камандаваннем оберфюрэра С.С.Дырлевангера.

Ужо ў першыя дні вайны на тэрыторыі раёна ў розных кутках пачалі стварацца партызанскія групы з мясцовага насельніцтва і воінаў-акружэнцаў.У пачатку лета 1942 г. на тэрыторыі Лагойскага і Плешчаніцкага раёнаў налічвалася некалькі партызанскіх атрадаў.Аднак дзейнічалі яны разрознена, без адзінага кіраўніцтва.Таму 15.07.1942г. быў створаны кіруючы цэнтр адзінага камандавання.

Партызанскі рух рос і шырыўся.Аб гэтым у сваіх данясеннях пісалі самі акупанты.У адным з данясенняў з Плешчаніц камандзіру жандармерыі Беларусі ад 10.12.1942 г. паведамілася: “За апошні час дзейнасць партызан узмацнілася...Партызаны паказваюцца не толькі ўначы,але і днём, асабліва ў месцах, якія знаходзяцца ў баку ад гарнізона…”

Далей у дакладной гаворыцца, што колькасць нападаў павялічылася да 71.
І тут жа канстатуецца факт абстрэлу і падрыву аўтамашын з жывой сілай праціўніка ў вёсках Камена,Літвічы,Задор`е.

Да вайны нашы вескі Амнішава, Літвічы,Засоўе,Пушча, Слабада адносіліся да Амнішаўскага с/Савета.І так ужо здарылася, што і Літвічы, і Амнішава стаялі на дарозе Плешчаніц-Бягомль. Вельмі часта дарога абстрэльвалася,мініравалася партызанамі, часта выходзіла са строю і тэлефонная сувязь.Поспехі народных мсціўцаў прыводзілі ў шаленства акупантаў…Аб гэтым сведчаць архіўныя матэрыялы.

Дакладная запіска лейтэнанта рэзерва ахоўнай паліцыі начальніку СС і паліцыі Барысаўскай акругі аб дзеяннях партызан паведамляе:”25.05.1943г. капитан ВВС Хааре вместе с 20 унтер-офицерами и рядовыми направился в д.Литвичы для мобилизации рабочей силы в Германию.Примерно в 11:30 капитан Хааре с одним унтер-офицером 7 рядовыми на 1-й автомашине выехали в Плещеницы”. Далей гаварылася, што “в 12:30 оставшиеся были внезапно атакованы. Партизан было примерно человек 200. Солдаты вермахта, оставив убитых и тяжело раненых,отступили в направлении д.Околово.Капитан Хааре,получивший в Плещеницах сообщение о нападении на его команду в Литвичах,связался с батальоном Дирлевангера,занимавшим позиции в д. Буда,и попросил о помощи.

28.05.1943г. батальон Дирлевангера предпринял нападение на д.Литвичи,где обнаружил 11 человек из команды Хааре убитыми и 3 человека пропавшими.

Прадигер,лейтенант резерва охранной полиции.1 июня 1943г. расстреляны за бандитскую деятельность жители д.Засовье Стефан Крамаревич и Жаворонок.

Кляй, майстер и начальник поста жандармерии”. 1

У кнізе “Дальва – сястра Хатыні” яе аўтар Мікалай Гірыловіч піша,што 15 чэрвеня 1944г. іх з Дальвы гналі на Палік дарогай Плешчаніцы-Бягомль.”Карнікі не ішлі спераду. Баяліся,што партызаны замініравалі дарогу,і гналі дальвінцаў перад сабой.Неўзабаве перад імі раскінулася шырокае поле і ніводнай хаты.Толькі нейкія слупы віднеліся ўперадзе.

Падышлі бліжэй. Не слупы гэта - абгарэлыя каміны сярод пажарышча. Месцамі чарнату ўжо накрыў бур`ян.

-Літвічы ,- уздыхнуў дзед. - Тут былі Літвічы. Хутка , нібы баючыся чорнага пажарышча, прайшлі былой вёскай. Чорныя стаялі дрэвы, абвугленае бярвенне,абгарэлыя платы. Гэты успамін пацвярджае той факт, аб якім сведчыць дакладная запіска, што на тэрыторыі Амнішаўскага с/С дзейнічалі партызаны, сведчаць і іншыя дакументы. Ва ўспамінах Івана Іосівавіча Ясіновіча, былога сакратара Плешчаніцкага падпальнага райкома КП(б)Б гаворыцца:”На одном из заседаний в июле 1943г.мы закрепили членов и инструкторов РК КП(б)Б за сельскими Советами… После утверждения П.Н. Кульгова членом райкома за ним закрепили Амнишевский, Горневский и Избищенский сельские Советы”.

Жыхары нашых вёсак арганізоўвалі пастаўку прадуктаў харчавання, збор зброі, шылі абмундзіраванне для партызан. Начальнік штаба партызанскага атрада “Барацьба” А.М.Філатаў успамінаў: “31 мая 1944г. брыгада вяла баі на рацэ Дзвінаса ў раёне в.Чысты Бор. Затым заняла абарону на рубяжы Амнішава-Дальва,які ўтрымлівала на працягу 1 і 2 чэрвеня 1944г.”Гэты ж факт прысутнічае і ў гістарычных матэрыялах брыгады ”Народныя мсціўцы” імя В.Варанянскага. Камандзір брыгады падпалкоўнік Пакроўскі канстатуе, што “31 мая брыгады вялі баі на р.Дзвінаса. У 14:00 брыгада заняла абарону на рубяжы “Займішча-Пячное-Жасцінае.Прыняўшы бой на гэтым рубяжы, брыгада адышла за шасейную дарогу і заняла абарону на рубяжы Амнішава-Палевічы-246,6- Круты Бор, гэты рубеж утрымлівала на працягу 1 і 2 чэрвеня 1944г.У 22:00 2 чэрвеня камандаванне брыгады загадвае адысці ў раён Хатынь-Селішча.”

Гэта ўжо быў пачатак вялікага вызвалення Беларусі. Са шматпакутнай зямлі Лагойшчыны адкрываліся шляхі вызвалення на Мінск і Маладзечна.

Так сведчыць гістарычныя матэрыялы. А дзіцячая памяць апавядае сваё. Чытала сухія лічбы дакументаў. Яны сурова раскрывалі памеры трагедыі. Ім верыш, бо гэта дакуменальныя факты. А яшчэ больш верыш жывому слову сведку трагедыі. Жанчыны гаварылі па-featureнаму: скупа, саромеючыся, эмацыянальна, падрабязна, але ў кожным успаміне боль і жаль, нейкая нават віна і роспач. І так хацелаяс кожную абняць, прыгалубіць, супакоіць:

- Гэта ўжо было! Мінула! Не будзе! Дай, Бог, каб не было!

---

1 Нацыянальны архіў РБ, ф.4683, воп.3, стр.970, л.46,47,49

## ТАК СКОНЧЫЛАСЯ ДЗЯЦІНСТВА

Л.І.Юргінс на пытанне: "Што захавалася ў памяці аб дзяцінстве?" адказала коратка: " А яно скончылася, дзяцінства. Яго, амаль што ў мяне і не было".



А скончылася яно адразу, раптам, у адзін дзень. Майскай сонечнай раніцай сорак трэцяга года.

Вы можаце сказаць, што так не бывае, каб раптам, імгненна? Што гэта адбываецца паступова, патроху і цягнецца доўга? Магчыма, гэта так. Ніхто спрачацца не стане.

Аднак маё развітанне з дзяцінствам скончылася адразу, хаця пачалося, думаю, раней.

Можа, гэта пачалося тады, калі я ўпершыню ўбачыла ў небе чужыя самалёты? Павыбягалі з хат дарослыя і дзеці, і хтосьці закрычаў: "ВАЙНА!"

Ці, можа, тады, калі па шашы Мінск-Віцебск загрукатала нямецкая ваенная тэхніка?

А можа, тады, калі маю родную вёску пачалі наведваць партызаны?

А можа, у тую раніцу, калі карнікі акружылі Літвічы і загадалі ўсім сабрацца ў цэнтры вёскі? Маладых хлопцаў і дзяўчат пасадзілі ў грузавікі і павезлі ў бок Плешчаніц. Пасля мы даведаліся, што іх адправілі ў Германію.

А скончылася маё дзяцінства тады, калі я, вярнуўшыся на наступны дзень з лесу, убачыла, як дагаралі будынкі нашай вёскі і сярод галавешак ляжалі трупы людзей.

Л.І. Юргінс

# Вёска мая родная

Трымаю ў руках кнігу “Памяць”. Старонка 268.
Чытаю:

Вёска мая родная

Раненне, атрыманае ў час Вялікай Айчыннай вайны, калі я быў падлеткам, даўно загаілася, а вось душэўныя траўмы, звязаныя са стратай родных і блізкіх мне людзей, пастаянным болем у сэрцы напамінаюць і зараз.

Здарылася гэта 23 мая 1943 года. У той далёкі дзень я страціў бацьку, маці і дзвюх сясцёр. А днём раней акупанты схапілі і павезлі ў Германію майго брата Віктара, адкуль ён ўжо не вярнуўся.

У тыя дні гітлераўцы праводзілі буйна маштабную аперацыю па ліквідацыі партызан Барысаўска – Бягомальскай зоны. 21 мая ў мае родныя Літвічы з боку Плешчаніц уварваўся карны батальён.У вёсцы якраз знаходзіліся партызаны, якія збіралі прадукты для атрада, што знаходзіўся непадалёк у лесе. Завязалася перастрэлка. Партызаны змаглі пазбегнуць страт і схавацца ў лесе.

На наступны дзень Літвічы з раніцы акружылі карнікі і загадалі ўсім жыхарам сабрацца ў цэнтры вёскі. Маладых дзяўчат і хлопцаў пасадзілі ў грузавікі і павезлі ў бок Плешчаніц, а астатнім сказалі, каб разыходзіліся па хатах.

Але неўзабаве каля вёскі пачалася страляніна – гэта партызаны атакавалі карнікаў. Бой зацягнуўся, у ходзе яго шмат фашыстаў загінула. У час бою адзін немец забег у крайнюю хату. Партызан, які гнаўся за ім, шпурнуў гранату. Раздаўся выбух, у выніку загарэўся дом, у якім знаходзілася сям`я каваля С. Астроўкі. Фашыста забіла, а з членаў сям`і, дзякуй Богу, ніхто не пацярпеў.

Пасля гэтага заставацца ў вёсцы было небяспечна, частка жыхароў Літвіч падалася ў лес. Наша сям`я накіравалася ў суседнюю вёску Засоўе. Акрамя нас, там знайшлі прытулак яшчэ некалькі сем`яў, усяго чалавек дваццаць. Так-сяк пераначавалі. А на наступны дзень вырашылі схадзіць у Літвічы і забраць адзенне, гаспадарчы інвентар. Людзі былі ўпэўнены, што за сваё паражэнне фашысты спаляць вёску. З маці і сястрычкай Марыйкай мы спакавалі дамашні скарб на калёсы і рушылі з Літвіч. На вуліцы ўбачылі сваіх суседзяў з дзецьмі, якія сказалі, што ў вёсцы немцы.

Выехаўшы ў поле, я ўбачыў непадалёк калону гітлераўцаў. Вырашыўшы вярнуцца за суседзямі, павярнуў каня назад і пагнаў яго. Тым часам нашы суседзі накіраваліся ў бок Пушчы, а я ў бок Слабады. І тут пачалася страляніна, кулі свісталі зусім побач. Я зразумеў, што фашысты страляюць па мне. Конь ад страху панёсся галопам. Мне ўдалося саскочыць з калёс і бегчы ззаду. Ногі падкошваліся, унутры акамянела, але спыняцца было нельга. Нарэшце я паваліўся пад куст і пачаў прыслухоўвацца. Прыйшоўшы ў сябе, убачыў страшнае відовішча: гарэлі мае родным Літвічы, родная бацькаўская хата. Дзе цяпср маці і сястрычка, я не ведаў, бо яны адсталі ў час уцёкаў.

Праз некаторы час я выбраўся на дарогу і пайшоў у бок Слабады. Яна была ачэплена карнікамі. Мяне затрымалі і прывялі да нейкага начальніка. Ён размаўляў на рускай мове і запытаў, што я тут раблю. Адказаў, што іду з вёскі Літвічы, якую спалілі. Мне дазволілі прайсці ў Слабаду. Адтуль я прабраўся ў Засоўе.

Нарэшце сустрэўся з бацькамі, якіх маё вяртанне моцна ўзрадавала. Дзіўна, але і конь, на якім я ехаў, самастойна прыцягнуў падводу ў Засоўе.

Надвячоркам я схадзіў у Літвічы. Тое, што ўбачыў, моцна ўразіла. Паветра было напоўнена дымам, дагаралі будынкі. Сярод галавешак ляжалі трупы людзей, маіх аднавяскоўцаў. Вярнуўшыся назад, пра ўбачанае расказаў бацькам. Уся сям'я вельмі перажывала А назаўтра ў хату, дзе спыніліся мы і яшчэ некалькі сем'яў, зайшлі два карнікі. Сказалі, што будуць правяраць дакументы. Затым яны аб нечым пагаварылі і адзін з іх пайшоў. Але неўзабаве вярнуўся з ручным кулямётам. Зайшоўшы ў хату, ён адкрыў стральбу па прысутных. Раздаліся крыкі, стогны, плач .

Я адчуў востры боль у левым бядры і паваліўся. Побач з сабой разглядзеў бездыханнае цела сваей сястрычкі Марыйкі. Тым часам карнікі павыбівалі вокны і надпалілі дом. Разам з братамі Астроўкамі Віктарам і Адамам мне ўдалося выбрацца праз акно, калі ўсё наўкол ужо было ахоплена полымем.

Сцякаючы крывёю, я направіўся ў лес. Там нас сустрэў партызанскі разведчык Зайчанка, які перавязаў мне рану і параіў прабірацца ў вёску Васількоўку. Ісці далей я не мог, бо сілы былі на зыходзе. Тады Адам узяў мяне на плечы і панёс. Так мы прыйшлі ў Васількоўку, у якой знаходзіўся партызанскі атрад «Народныя мсціўцы» брыгады Варанянскага. Мяне акружылі клопатам і ўвагай партызаны і мясцовыя жыхары. Але партызанам з сабой узяць мяне не было магчымасці. Ісці я не мог, моцна разбалелася нага. Тады мясцовая жыхарка Шапялевіч Зінаіда Дзмітраўна і яе брат Андрэй паклалі мяне на павозку і завезлі ў лагер, дзе хаваліся жыхары ад карнікаў. За гэта шчыры дзякуй ім і нізкі паклон гэтым добрым людзям. Пасля гэтага я яшчэ доўга лячыўся. Кулю дасталі толькі праз два гады.

Уладзімір Жаваранак, жыхар вёскі Літвічы.

## Выратавала маміна кроў

Далей чытаю ў кнізе “Памяць”: “Засоўе.
У Вялікую Айчынную вайну гітлераўцы спалілі ў вёсцы 58 двароў, загубілі 235 жыхароў”.

З болем у сэрцы слухаеш успаміны тых, каму ўдалося выжыць. Вось што паведаміла Алена Ільінічна Батура



Той раніцай мама згледзела праз акно немцаў, што ішлі праз двор да нас. Падумала, можа, у Германію будуць забіраць. І кажа мне: “Лезь, дачушка, на печ, схавайся і сядзі”. Сяджу там цішком, чую ў хаце галасы: “Дзе хазяін?” - “Няма ў мяне хазяіна, памёр”. - “А сыны твае дзе?” “ - Ды вось адзін у ложку спіць, другі ў пуні недзе”. І тут жа – стрэл, чую: мама упала. Услед яшчэ стрэлы, меншых брата і сястру ў ложку забілі. Страшна мне, ды стрымалася, голасу не падала. Пастралялі і пайшлі. Чую, страляюць ужо ў суседняй хаце – Анэлю Баборовіч з дочкамі. Што ж, думаю, рабіць? Злезла ўсё ж з печы і хуценька ў пограб, што быў пад падлогай, забралася, дошчачкі зноў закрыла. Падумалася: гэта ж зараз хату паліць прыйдуць, я і згару тут. Выбралася – і за дзверы, у гародчык кінулася, лягла ў баразёнцы, выпрасталася, бы нежывая. Здаецца, каб зямля правалілася, ды каб паглыбей. А побач крокі, ідуць паліць нашу хату. “ Во, - гавораць, уцякла, дык у гародзе забілі”. Я ж не ведала, што мая спіна ўся ў крыві. Як сядзела ў пограбе, дык зверху кроў на мяне цурчэла праз шчыліну. Маміна кроў мяне і ўратавала.

А тыя двое ў хату зайшлі, падпалілі. Мне горача становіцца, іскры зверху сыплюцца. Я жменяю зямлю грабу ды на сябе сыплю. Пасмялела, як пайшлі яны з двара, прыўзнялася на локці ды паўзком, паўзком, каб далей ад агню. Выкацілася з град і зноў у баразну, дзе бульба пасаджана. Так і праляжала, пакуль ўсё сціхла. На ногі ўстала, глянула – гарыць суседняе Амнішава. Іду сваёй вуліцай – хаты дагараюць, скрозь людзі пабітыя ляжаць. Што ж мне рабіць? І рашыла – падамся ў Гарэлае, там цётка мая жыла.

## НЕМЦЫ ПАЛЯЦЬ СЯЛО

Успаміны сведкі тых падзей Шапялевіч Юзэфы Пятроўны.



Засоўе палілі немцы раніцай у панядзелак, хаця прыехалі ў нядзелю.У весцы загаварылі, што моладзь будуць браць у Германію.Таму мама, устаўшы вельмі рана,пайшла да цеткі,што жыла на другой вуліцы,каб узяць крыху бульбы і спячы мне праснак на дарогу. Мяне пабудзіла пасвіць карову,а малодшая сястра Ядзя ў гэты час спала.

Праз некаторы час я пачула стрэлы.Стралялі ў розных канцах вёскі.Але я не ўцякала, думала, што гэта партызаны напалі на немцаў. Потым я ўбачыла, што сям'я Грыня выбегла на вуліцу і ў гэты час да іх падскочылі немцы, вярнулі ўсіх у хату і расстралялі. Раптам заўважаю, што гарыць вёска, і тады я зразумела,што немцы забіваюць людзей і паляць сяло.

Я хуценька схавалася пад бярвенне, каля якога стаяла, а калі ўсё сціхла, вылезла. Кругом усе гарэла. Загінула мая малодшая сястра,на шчасце, маме ўдалося выратавацца. Жылі ў зямлянцы аж да канца вайны.

## Мама, даруй маё дзіцячае непаслушэнства

Гэта было 22 мая 1943 года. Немцы акружылі вёску і пачалі акопвацца. Вечарам наладзілі вечарынку. А раніцай на наступны дзень пайшлі па хатах і пачалі расстрэльваць людзей. Пасля падпалілі будынкі.

У гэты час я і мае браты Пеця і Стась спалі ў пуні. Пачуўшы стрэлы і крыкі, прыбеглі ў хату. Мы ўбачылі, што мама і тата мёртвыя. Я завязала маме хустку (не ведаю чаму), і мы пабеглі з хаты. Мы сталі ўцякаць ад немцаў і кінуліся ў бок Гарэлага, дзе было балота. Але раптам я ўспомніла сваю маму, што засталася ў хаце ляжаць, і пабегла з сяброўкай Ленай назад, у сяло, якое ўжо гарэла. Мы выбеглі прама на немцаў. Адзін падышоў да нас, паглядзеў, а потым, нешта сказаўшы па-нямецку астатнім, вывеў нас з балота на сцежку, якая вяла ў Гарэлае. Мы пабеглі, а немец выстраліў уверх.

Нас прыхінула адна жанчына, у якой было сваіх пяцёра дзяцей. Вечарам я знайшла Пецю і Стася. Усе разам мы прабылі тут цэлую нядзелю.

Праз некалькі дзён нас забраў дзядзька, і мы сталі жыць у вёсцы Крутая Гара.



Ведаеце, дзеткі, столькі год прайшло, а ў памяці чамусьці стаіць гэтая жахлівая карціна: мама ляжыць забітая ў завязанай мною хустачцы. І кожны раз я прашу ў яе прабачэння, каб даравала мне маё дзіцячае непаслушэнства, калі нядобра што гаварыла ці рабіла, калі замест таго, каб смяяцца з нашых дзіцячых выхадак, ей даводзілася плакаць. А аднойчы прачытала ў часопісе верш. І так ён мяне ўзрушыў, што я яго запомніла адразу. Бо гэта напісана пра мяне, пра нас, дзяцей-засоўцаў, якія, як і я, асірацелі той раніцай 1943г.

Маёй мамы няма анідзе,
Я гукаю – аж ломіць грудзі.
Маёй мамы няма анідзе,
Людзі кажуць:”Ужо і не будзе…”
Маёй мамы няма анідзе,
Я ж не веру, крычу, захлынаюся.
Маёй мамы няма анідзе…
І з гадамі я з гэтым звыкаюся.

Мілыя мае ўнукі, не давядзі Гасподзь вам паспытаць сірочае долі. Як бы мне хацелася, каб толькі нашае пакаленне пранесла жах вайны, хай бы гэтае слова “вайна” і пахаванае было разам з намі.

## Ад дыму балелі вочы

Пра жахі вайны расказала нам і адна са старэйшых жыхароў вёскі Кальніцкая Ядвіга Пятроўна



Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, мне было шэсць год. Немцы наведвалі вёску рэдка. Прыязджалі толькі да старасты Жаваранка Пятра. Немцам ён дапамагаў ці партызанам я не ведаю, але ні разу не чула, каб пра яго гаварылі што-небудзь дрэннае. Сям'ю яго пасля немцы забралі ў Германію, а самога расстралялі ля Гарбатага маста. Там і была яго магіла.

Калі аб'явілі, што пачалася вайна, калгас расфарміравалі. Хто ўзяў карову, хто каня, а сястра Сабіна, якой было ўжо 18 год, прывяла жарабя. Бацькі ў гэты час дома не было. Немцы забралі яго ў абоз.

Раніцай, як і заўсёды, сястра завяла на лагчыну жарабя і навязала. Ідучы дамоў, убачыла, што гарыць канец адной вуліцы, і хуценька прыбегла ў хату. Я і мой старэйшы брат Аляксандр яшчэ спалі ў гэты час. Мама нас разбудзіла, і мы ўсе пабеглі да Грамовіча Юстына (мама разгубілася і не ведала, што рабіць без бацькі). Там ляжалі на падлозе ўжо забітыя гаспадыня і дзеці. Тады мы праз вуліцу пабеглі да Казіміра (прозвішча не памятаю). Тапілася печ, стаялі гаршкі на прыпечку, а на зямлі ляжала забітых аж 12 чалавек. Мы выскачылі з хаты і

павярнулі на сцежку, што вяла да вузенькай рэчкі, праз якую быў мосцік. У гэты час да нас далучылася двое дзяцей. Гэта былі Пеця і Стась Родзевічы.

За сялом на пасту стаяў немец. Убачыўшы нас, ён спачатку пабег за намі, а потым прыпыніўся, стрэліў адзін раз і вярнуўся назад.

Немцы, пачуўшы стрэл, хутка згледзелі нас і застрачылі з кулямётаў. Мы ўжо былі каля рэчкі, паваліліся, прыцiснуліся да зямлі. Але доўга ляжаць не маглі, баяліся, што яны нас дагоняць і расстраляюць. Надзеі на выратаванне не было, і мама сказала, што прыйдзецца тапіцца. Мы заплакалі, а Пеця і Аляксандр сказалі, што яны пабягуць да кустоў. Так яны і зрабілі. Кулі свісталі з усіх бакоў, але хлопцам удалося ўцячы.

Калі страляніна сціхла, мы выпаўзлі на ўзгорак (мінуць яго не было як), дзе расла пшаніца, і па двое заляглі ў баразёнкі. За мной ляжала Сабіна, а за Стасем – мама. Пшанічка была зусім маленькая, і мы, вядома, былі бачны з вёскі. Як толькі мы зашавелімся і пачынаем паўзці, немцы пачынаюць страляць. Мы сцішымся, паляжым. Потым Сабіна стукае мне у пяту ( гэта каманда паўзці), і мы зноў паўзём, а немцы пачынаюць зноў страляць. Так было некалькі разоў.

І вось доўгачаканыя кусты і балота.Мы выратаваліся. Але Сабіну параніла ў нагу. Мама перавязала ёй рану, і мы адышліся яшчэ далей. Аднак мы бачылі, як гарэла вёска, як ад’язджалі машыны. А затым у небе не стала і самалётаў.

Нам вельмі хацелася есці. Мы не ведалі ўжо, як нам быць і што рабіць. У гэты час да нас падышоў Юстын. Ён нам расказаў сваю трагедыю: забіта ўся яго сям’я. У вёсцы засталася адна толькі цэлая хата, хата Казіміра, у якой на падлозе ляжаць 12 чалавек забітымі.Параіўшыся, вырашылі ісці ў тую хату, бо выхаду ніякага не было: мерзлі ўсе.

І мы пайшлі.У хаце ляжалі забітыя.Я, Аляксандр і Пеця, сцішыўшыся, хутка заснулі ў кутку, мама і Юстын пайшлі па вёсцы пашукаць чаго-небудзь. Сабіна і Стась былі большыя, заснуць яны ніяк не маглі, ім было страшна ляжаць з мёртвымі, таму яны разбудзілі нас, і мы ўсе разам пайшлі ў калгасную пуню, якая была за сялом. Там засталося яшчэ сена, і мы сагрэліся.

На наступны дзень у вёску прыйшлі паліцаі. Яны сказалі, каб мы ішлі ў Задор’е, бо хутка прыедуць немцы за жывёлай.

І мы пайшлі. Сабіні вельмі балела нага. Яна не магла ісці, а наперадзе - балота і рэчка. Тады мама зноў пакінула нас, пайшла ў Гарэлае і папрасіла Астроўку, нямога і вельмі дужага мужчыну, каб ён перанёс Сабіну праз рэчку і балота. Ён так і зрабіў.

У Задор’і нас прыняла адна жанчына, мы некаторы час пажылі ў яе. У сястры стала гаіцца нага. Людзі дапамагалі як маглі. Аднак праз некаторы час нас адправілі назад. Вёску наведвалі паліцаі, і гаспадыня хаты баялася, што яны данясуць немцам пра нас, і іх таксама могуць спаліць.

Адзін чалавек запрог каня, давёз нас да рэчкі, той жа Астроўка перанёс сястру праз балота, і мы вярнуліся ў Засоўе.

Немцам тут ужо не было чаго рабіць, яны нас больш не наведвалі. Мы сталі жыць у Рахвалёнкавай пуні. Было холадна і галадна.

Потым нас наведалі паліцаі. Яны загадалі нам пахаваць усіх мёртвых. У той адной уцалеўшай хаце ляжалі ўжо каторы час людзі, тыя 12 чалавек. Юстын, мама і мы, пяцёра дзяцей, хавалі ўсіх, хто ляжаў на зямлі. У хаце знялі дзверы, палажылі іх на акно і праз акно выцягвалі ўсіх (не было чым дыхаць), а потым закапалі. Пасля ўжо мы пахавалі ўсіх забітых жыхароў вёскі.

Затым паліцаі загадалі нам вымыць хату і жыць там, сказалі, што немцаў тут не будзе. І мы засталіся тут на зіму.

Я з жахам слухала. Мне старшна было сябе уявіць на іх месцы: мне страшна было гэта чуць, а як ім, васьмі – дзевяцігадовым дзецям цягнуць мертвых людзей, цяжкі пах ад якіх забіваў нос, горла, блажыў усю істоту.

Ядвіга Пятроўна працягвала расказ:

- Неяк раз мы пачулі, што пад печчу ёсць нешта жывое, чуваць як яно шавеліцца. Мы ўсе спалохаліся. Потым Юстын сказаў маме, каб яна не лезла, ёй трэба гадаваць дзяцей, а ён адзін, яму не страшна паміраць. Якое ўсім было дзіва, калі ён выцягнуў адтуль сабаку. Сабака быў вельмі слабы. Мы яго кармілі, і праз некаторы час ён паправіўся. Сабака нікога да нас не падпускаў. Гэта быў наш вартаўнік.

Аднойчы ён так стаў брахаць, што мы напалохаліся. Мама глянула ў акно і ўбачыла бацьку. Бацька ўцёк з абозу, скітаўся доўга і вось вярнуўся дамоў.

Потым мы пачулі, што будзе яшчэ адна аблава. Юстын сказаў, што павядзе нас ў Васількоўку.І мы праз Мачалішча (так называецца лес) рушылі ў дарогу. Аднак тут мы трапілі ў самае пекла. Бамбілі самалёты, толькі сукі ляцелі ў розныя бакі. Не было вады, не было як раскласці касцёр. Толькі вылезім са сваіх схованак пасля бамбёжкі, як самалёты зноў ляцяць.

І тады мы вярнуліся назад. Перайшлі дарогу, зноў аказаліся ў Мачалішчы. Тут было ўжо ціха. Да нас далучыліся яшчэ дзве жанчыны.Адна з іх Ядвіся, пляменніца Казіміра, у чыёй хаце мы жылі. Таму мы зноў аказаліся на вуліцы.

Аднак адзін чалавек аддаў нам сваю лазню, якая была сярод выгана. Сам ён пайшоў у Кромавічы да дачкі. Лазня была без коміна. Таму, калі падпальвалі печку, дым ішоў уверх і запаўняў усё наша жыллё. Мы клаліся на зямлю галовамі на парог. І так ляжалі, пакуль не сходзіў густы чорны і едкі дым.

Яшчэ перад вайной нам далі лес на хату. Тата злажыў 6 вянкоў, астатняе бярвенне ляжала на вуліцы. Зруб гэты і бярвенне не згарэлі, калі палілі вёску. Усёй сям'ёй мы цэлы год жылі ў лазні і будавалі хату.Тата ўсіх прымаў у хату, хто вяртаўся ў вёску. Спалі на палацях і на падлозе.

Вярнулася з Германіі сям'я паліцая. Тата ім сказаў : « З ядой я вам памагу, а ў хату не пушчу, капайце сабе зямлянку».

## Жывучы, усе зноў набудзем…

Не абмінула бяда і Амнішава. У Вялікую Айчынную вайну гітлераўцы спалілі 39 двароў з 41, загубілі 18 жыхароў з 211. Як гэта ўсе было нам паведаміла Гейна Валянцінаўна Адамаўна.



Калі пачалася вайна, мне было ўсяго 9 гадоў. Але я ўжо добра разумела, што з намі можа здарыцца, калі ў нашу вёску прыйдуць фашысты. Аб гэтым гаварылі дарослыя, а мы, дзеці, вядома, чулі ўсё. Жанчыны плакалі, мужчыны маўчалі. Змоўклі песні, смех.

І вось фашысты ў Амнішаве. Я іх ўбачыла толькі тады, калі яны ўвайшлі ў нашу хату. Іх было некалькі чалавек. Нас яны выгналі ў трысцень, а самі засталіся ў лепшай палове хаты. Маму яны заставілі рыхтаваць ім сняданак, абед і вячэру. Я, вядома, ёй дапамагала.

Мне было страшна. Я баялася немцаў і іх вялікіх і злосных сабак.

Але немцы доўга ў нас не затрымаліся, і мы з палёгкай уздыхнулі, калі яны нас пакінулі.

Ішоў трэці год вайны. Майскім ранкам я і мае сяброўкі пасвілі недалёка ад вёскі кароў. Раптам мы ўбачылі, што над Засоўем сцелецца чорны густы дым. Мы зразумелі, што гарыць вёска. Потым мы заўважылі машыны, якія рухаліся ў бок Амнішава. Мы кінулі кароў і хуценька пабеглі у вёску, каб папярэдзіць яе жыхароў.

Аднак ў вёсцы ў гэты час ўжо ніхто не спаў, і, ведаючы, што здарылася з Літвічамі і Засоўем, пабеглі хто куды змог. Большасць людзей уратавалася.

Наша сям’я схавалася ў балоце. Мы бачылі, як гарэла наша вёска.

Заціхла вечарам. Ну, думаем, адышла бяда, ды ці надоўга. Боязь перапаўняла людскія сэрцы. Мабыць, у такі момант людзі пачынаюць востра разумець, што жыццё – самае дарагое, што ёсць у чалавека. Ніхто не нёс з сабою хатні скарб – усе ратавалі сябе і дзяцей. Кожны твой дзянёк – гэта Божы дар. Гора страшэннае было, і ўсе малілі аднаго: захаваць жыццё, каб адвёў Гасподзь бяду. І бяда адышла: хаты згарэлі, а людзі засталіся жывымі. Ніхто не шкадаваў жылля, бо радасць застацца жывым была большая, яна глушыла горыч страт.

З жалем глядзелі бацькі на дзяцей, бо тыя, як быліначкі, туліліся да мацерак, не разумеючы ўвесь сэнс трагедыі. І хтосьці са старэйшых супакоіў усіх: "Добра, што жывымі засталіся, а жывучы, усё зноў набудзем".

Тады мне гэтыя словы паказваліся такімі правільнымі, нават выратавальнымі, што я шчыра верыла: у хуткім часе ўсё будзе добра.

Ды гэты хуткі час расцягнуўся на цэлы год. Але ж адбудавалася Амнішава пасля вайны. Шкада, што цяпер, ў мірны час, вёска вымірае, разляцеліся амнішаўцы, апусцелі бацькоўскія двары. Можа, і вайна ў гэтым вінаватая.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Жыццё дадзена на добрыя справы

І сапраўды вінаватая вайна. Ніколі ніхто не вызначыць меры гэтай віны – яна бязмерная. Населеныя пункты: Літвічы, Амнішава, Засоўе знайшлі ў сабе сілы ўзняцца з папялішча пасля вайны,а Слабада скіпела назаўжды. Астаўся ад яе толькі ўспамін, ды магіла ў мемарыяльным комплексе “Хатынь”




Але гэта ўжо другая гісторыя, новая работа – адрадзіць памяць аб Слабадзе і слабадчанах, і яе абавязкова выканаю, каб жыла ў нашай памяці Вялікая Перамога.

Дапісаны апошні сказ, але знак прыпынку не хачу ставіць. Зноў вяртаюся да дзяцей-падранкаў: Ванда, Ядзя, Рэня, Лёця, Альдзя… Імёны засталіся з таго

часу дзяцінства: так іх клікалі бацькі і сябры. Яны перажылі жахі Вялікай Айчыннай вайны і свае шэсць, восем, дванаццаць гадоў адразу пасталелі, сталі самастойнымі, дарослымі.

Зараз яны ўжо бабулі-дзядулі, дапамагаюць гадаваць унукаў. Яны пражылі сумленна сваё жыццё, і цяпер ім патрэбна ўвага і крышачку душэўнай цеплыні, бо

…ім – знявечаным калісь вайной –
Усё цяжэй з пакутамі спраўляцца,
Трымацца з мужнасцю непаказной.[1]

Я гэта разумею і хачу зрабіць ім нешта прыемнае. Сваім аднакласнікам я прапанавала выдаць школьны зборнік-альманах “Вялікая Перамога ў нашай памяці жыве” з надрукаванымі ўспамінамі, з каляровымі фотаздымкамі і падарыць усім дзецям ваеннай пары. Маю прапанову падтрымалі, маё жаданне ўжо здзейснілася. Як жа радаваліся жанчыны, калі прымалі маленькія кніжачкі з фотаздымкамі. Вільгатнелі вочы, і дрыжалі словы падзякі: “Гэта ж такая нам, дзеткі, пашана!А што ж тым, хто не дачакаў радаснага вызвалення?...”

Тады я разгубілася, а цяпер цвёрда ведаю: 25 мая 2010 года ў царкве я пастаўлю свечкі і закажу памінальную малітву за ўпакой душ усіх сваіх землякоў у знак памяці аб іх.

[1] Гілевіч Н.

Вечны матыў: Лірыка, паэмы, раман у вершах: Для ст. шк. Узросту/ Маст. А.У.Басалыга. – Мн.: Юнацтва, 1994. с. 105